# ФАРМІРАВАННЕ ДАСЛЕДЧАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ ПРАЗ ЭКАЛАГІЧНУЮ АДУКАЦЫЮ НА ЎРОКАХ БІЯЛОГІІ

***Белагаловая М.С.,***
*настаўнік біялогіі ДУА "Сярэдняя школа № 23 г. Гродна", магістр біялагічных навук,*
*г. Гродна, Рэспубліка Беларусь*

Ключавыя словы. Даследчая кампетэнтнасць, вучэбна-даследчая дзейнасць, экалагічная адукацыя, біялогія.

Keywords. Research competence, educational and research activities, ecological education, biology.

Сучасны школьнік павінен прыйсці ў дарослы свет markdown рознабакова развітым, здольным самастойна рашаць складаныя пытанні, знаходзіць патрэбныя варыянты рашэння розных экалагічных праблем і сітуацый, прапаноўваць свае ідэі і праекты. Вялікую дапамогу ў фарміраванні самастойнай асобы школьніка аказвае даследчая дзейнасць.

Найбольшай эфектыўнасцю ў фарміраванні даследчай кампетэнцыі навучэнцаў адыгрываюць метады і прыёмы навучання, якія ўяўляюць сабой складанае ўзаемадзеянне слова, нагляднасці і практычнай дзейнасці.

Мэта работы – выдзеліць прыёмы і метады работы на ўроку біялогіі для фарміравання даследчай кампетэнцыі навучэнцаў.

**Матэрыял і метады**. Пры правядзенні даследавання мы кіраваліся праграмамі і падручнікамі па вучэбным прадмеце «Біялогія» для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Былі скарыстаны наступныя метады: параўнальны і сістэмна-комплексны аналіз нарматыўных дакументаў, літаратуры па доследнай праблеме, абагульненне перадавога педагагічнага досведу.

**Вынікі і іх абмеркаванне**. У аснове даследчай кампетэнтнасці ляжыць паняцце «ўменні» як гатоўнасць асобы да пэўных дзеянняў і аперацый у адпаведнасці з пастаўленай мэтай, на аснове ведаў і навыкаў.

Фарміраванне даследчых уменняў магчыма пры правядзенні даследчай працы ў два этапы: тэарэтычны і практычны. Асноўная дзейнасць належыць на першым этапе настаўніку, ён з'яўляецца памочнікам, паплечнікам у пошуках ісціны і авалодання майстэрствам, далучае вучняў да прадмета. Другі этап з'яўляецца працягам першага. Толькі на гэтым этапе навучэнцы самастойна павінны праводзіць даследаванні, фарміраваць і замацоўваць дадзеныя ўменні. Задача настаўніка арганізаваць дзейнасць па вывучэнні даследчых уменняў. Гэта магчыма толькі выкарыстоўваючы на ўроку розныя прыёмы і формы работы.

У сваёй дзейнасці выкарыстоўваем урокі-даследаванні або ўрокі з элементамі даследчай дзейнасці. На такіх уроках ставім дзве мэты: навучанне прадмету (дыдактычная мэта) і навучанне даследчай дзейнасці (педагагічная мэта). Напрыклад, падчас правядзення экскурсіі прапануем навучэнцам паназіраць за жыццём птушак восенню, зімой, вясной (6 клас), адзначыць асаблівасці. Пры вывучэнні тэмы «Будова і функцыі органа зроку» (9 клас) вучні звяртаюць увагу на змену дыяметра зрэнкі ў суседа пры павелічэнні ці змяншэнні асвятлення.

Прыём «Даследуем і вучымся разам» прымяняем, калі неабходна дапамагчы навучэнцам выдзеліць элементы аб'екта, іх супадпарадкаванасць. Напрыклад, пры вывучэнні тэмы «Унутраная будова сцябла» (7 клас) са школьнікамі вывучаем мікрапрэпараты ўнутранай будовы сцябла ліпы, паэтапна разглядаем структуры, адзначаем асаблівасці будовы і функцыі, параўноўваем з будовай кораня, адзначаем рысы адрознення [1].

Для навучэнцаў сярэдніх класаў эфектыўна выкарыстоўваць экспрэс-даследаванне. Школьнікам прапануем індывідуальныя заданні для правядзення эмпірычных даследаванняў, напрыклад, якія птушкі жывуць у нашым горадзе, якія расліны растуць на прышкольным участку, якія пакаёвыя расліны растуць у кабінеце біялогіі.

Тэарэтычныя экспрэс-даследаванні арыентаваны на працу па вывучэнні і абагульненні фактаў, матэрыялаў, якія змяшчаюцца ў розных крыніцах. Тэмы такіх даследаванняў павінны дазваляць вывучаць самыя розныя аб'екты ў іх рэальным асяроддзі, у дзеянні, даваць вялікі матэрыял і дазваляць убачыць мноства тэм для ўласных пошукаў, пабудовы розных гіпотэз.

Вучэбна-даследчая дзейнасць вучняў дапамагае зразумець сутнасць біялагічных працэсаў, якія праходзяць у прыродзе. Дадзеныя метады і прыёмы навучання могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы навучэнцаў да алімпіяд, выкананні работ навучэнцаў даследчага характару, што спрыяе трываласці ведаў, развіццю творчых здольнасцяў [2].

Да ўрока даследавання неабходная вялікая творчая падрыхтоўка, якую атрымліваюць навучэнцы на традыцыйных навучальных занятках і першаснаму замацаванню новых ведаў і спосабаў дзейнасці. Ужываць урокі-даследавання варта, калі навучэнцы тэарэтычна падрыхтаваныя для набыцця новых ведаў. Цяпер вучню трэба будзе прааналізаваць магчымасць прымянення раней атрыманых ведаў для вырашэння пастаўленай праблемы. Веды, атрыманыя вучнем самастойна шляхам спроб і памылак, перабору розных інструментаў, прымянення разнастайных формул і дзеянняў, застануцца ў яго памяці надоўга, а каштоўнасць разумовага працэсу, які, на жаль, нельга апісаць і вымераць, цяжка пераацаніць.

З мэтай развіцця даследчых здольнасцей вучняў эфектыўна выкарыстанне практыка-арыентаваных заданняў. Пры вывучэнні тэмы «Роля чалавека ў прыродзе. Ахова жывой прыроды» ў 7 класе дзелім вучняў на групы: «Дэпутаты», «Інспектары, «Турысты», «Рэкламны аддзел», «Вучоныя» и «Егеры». Кожнай групе неабходна выканаць сваё заданне:

– «дэпутаты» – працуюць з адаптаванымі вытрымкамі закона Рэспублікі Беларусь «Аб Асоба ахоўных прыродных тэрыторыях», запаўняюць табліцу «Тыпы ААПТ»;

– «інспектары» – працуюць з адаптаванымі вытрымкамі закона Рэспублікі Беларусь «Аб Асоба ахоўных прыродных тэрыторыях», ствараюць улётку, плакат «Запаведны рэжым»;

– «турысты» – працуюць з картай, на якой нанесены запаведная зона, зона адпачынку, помнікі прыроды, распрацоўваюць маршрут паходу выходнага дня;

– «рэкламны аддзел» – ствараюць рэкламны буклет нацыянальнага парку;

– «навукоўцы» – знаходзяць ахоўныя віды ў Чырвонай кнізе Рэспублікі Беларусь, малююць на плакаце 2 млекакормячых, 3 птушкі, 1 рэптылію, 1 земнаводнае, 2 рыбы, 3 насякомых, 5 раслін;

– «егеры» – вызначаюць жывёл па слядах, ствараюць даведнік-вызначальнік.

На дадзеным уроку з мэтай фарміравання экалагічнай культуры прымяняем метад праектаў (кожная група стварае свой «прадукт»), даследчы метад (праца з рознымі крыніцамі інфармацыі), інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі.

У выніку арганізаванай работы ў вучняў фарміруюцца наступныя кампетэнцыі:

– асобасныя: веданне асноўных прынцыпаў і правіл адносін да жывой прыроды; эстэтычных адносін да жывых аб'ектаў; усведамленне значнасці і агульнасці глабальных праблем чалавецтва;

– метапрадметныя: авалоданне зместам даследчай і праектнай дзейнасці, уменне адрозніваць па вонкавым выглядзе і апісаннях рэальныя біялагічныя аб'екты; ведаць і аргументаваць асноўныя правілы паводзін у прыродзе; аналізаваць і ацэньваць наступствы дзейнасці чалавека ў прыродзе.

**Заключэнне**. Такім чынам, працэс фарміравання даследчай кампетэнцыі ў галіне біялогіі ўключае разнастайныя прыёмы і метады навучання, ствараючы ўмовы для набыцця вопыту эмацыянальна-каштоўнасных адносін, актуалізацыі працэсаў самаразвіцця і самаўдасканалення асобы школьніка, фарміравання адносін супрацоўніцтва паміж настаўнікамі і вучнямі падчас навучання. Вучэбна-даследчая дзейнасць вучняў дапамагае зразумець сутнасць біялагічных працэсаў, якія праходзяць у прыродзе, шукаць шляхі вырашэння экалагічных праблем, зразумець неабходнасць змянення ролі чалавека ў сучасным свеце.

1. Дереклеева, Н.И. Научно-исследовательская работа в школе / Н.И. Дереклеева. – М.: Вербум–М., 2001. – 148 с.
2. Лешко, А.А. Программа изучения учащимися экологического состояния леса / А.А. Лешко, С.В. Чубаро, Г.А. Лешко // Экологическая культура и охрана окружающей среды: II Дорофеевские чтения : материалы междунар. науч.-практ. конференции, Витебск, 29–30 ноября 2016 г. – Витебск : ВГУ имени П.М. Машерова, 2016. – С. 159-161. – Режим доступа: https://rep.vsu.by/bitstream/123456789/9495/1/159-161.pdf. – Дата доступа: 06.07.2022.

## ЖАНР ФЭНТЕЗИ: ПРИЧИНЫ ПОПУЛЯРНОСТИ В СОВРЕМЕННОЙ ПОДРОСТКОВОЙ ЛИТЕРАТУРЕ

***Болтинова А.А.,***
*магистрант 1 года обучения ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*
*Научный руководитель –* ***Оксенчук А.Е.,*** *канд. филол. наук, доцент*

Ключевые слова. Фэнтези, жанр, жанрообразующие признаки, массовая подростковая литература, эскапизм.
Key words. Fantasy, genre, genre-forming features, mass teen literature, escapism.

С начала XXI века в массовой литературе резко возросла доля произведений, написанных в жанре фэнтези. Что характерно, подобный скачок чётко проявился именно в массовой подростковой литературе, что обусловливается неподдельным интересом подростков к данному жанру. Интерес для исследователя представляют причины возникновения такого интереса к фэнтези. По нашей мысли, искать эти причины следует в характерных особенностях самого жанра фэнтези, а также в явлении эскапизма.

Цель исследования – опираясь на характерные черты жанра фэнтези, а также на результаты анкетирования подростков, выявить наиболее существенные причины возрастания интереса подростков к произведениям, написанным в жанре фэнтези.

Актуальность данного исследования заключается в необходимости объяснений причин интереса к фэнтези на фоне увеличения количества произведений, написанных в данном жанре.

**Материал и методы.** Данное исследование было проведено при помощи теоретического метода и метода естественного эксперимента. Материалом для проведения исследования стала литература жанра фэнтези.

**Результаты и их обсуждение**. Одной из наиболее характерных черт литературного процесса XXI века стало развитие жанра фэнтези и становление его ведущим жанром в детской и подростковой литературе [1]. Говоря о фэнтези, прежде всего следует чётко выявить черты, определяющие его как жанр литературы. П.В. Королькова в своей статье, разводящей понятия фэнтези и литературной сказки, определяет следующие жанрообразующие особенности фэнтези: «Фэнтези –синоним <…> «фантастики меча и магии» («меча и волшебства»). <…> к сказочному повествованию и фэнтези традиционно относятся те произведения, в которых сверхъестественное начало является частью «естественного» мироустройства и считается «обычным» для описываемой модели реальности» [2]. Своё определение жанра фэнтези даёт Н.Г. Комлев: «Фэнтези (от англ. Fantasy – «фантазия» – это литературный жанр, возникший в первой половине XX столетия в англоязычной прозе; занимает промежуточное положение между научной фантастикой и сказкой, ведёт свою родословную от народных эпосов европейских стран <…>. Фэнтези богат поэтическими причудливыми образами, представляет сверхъестественные и нереалистические события и характеры. Основоположниками считаются американец Р. Говард и англичанин Р. Толкин». Об основных маркерах фэнтези писал и Е.Н. Ковтун: «<…> если при слове «фантастика» в 1950–1960-е в голове читателя возникал стандартный набор маркеров: роботы – звездолёты – <…> – коммунизм, то нынче <…> приходит на ум: магия – драконы– мечи и копья – путешествие необыкновенных героев за волшебным предметом» [3].

Для определения специфических жанрообразующих признаков фэнтези целесообразно проанализировать сами произведения. Обратимся к анализу наиболее известных произведений, написанных в данном жанре. Например, события серии романов Джоан